■ Персона

# «ЛЯЛЬКУ» РАЗУМЕЮЦЬ БЕЗ ПЕРАКЛАДУ,

## або Як былы ліцэйшчык стаў лялечнікам

**«Беларускі тэатр «Лялька» — адзін з культурных «брэндаў» не толькі Віцебска, але ўсёй краіны. Нядаўна творчы калектыў адсвяткаваў 30-ю гадавіну плённай працы дзеля мастацтва і гледача. Тэатр шмат разоў атрымліваў Гран-пры на міжнародных конкурсах. У яго рэпертуары ёсць спектаклі і для дарослых. Адзін са стваральнікаў тэатра, нязменны мастацкі кіраўнік, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь Віктар КЛІМЧУК сёлета адзначыць 70-гадовы юбілей. Не верыцца: стройны, стыльны, імпазантны... Віктар Ігнацьевіч поўны сіл і творчых планаў. Спадар Клімчук расказаў «Звяздзе» пра бацьку, які вярнуўся з-за акіяну, каб жаніцца ў Беларусі, пра сябе і пра гледачоў, жыццё якіх кардынальна змянілі спектаклі «Лялькі».**




Фота Аляксея СПАТКАЯ

### Як Джэк Васьмёркін: з Амерыкі — за шчасцем...

Будучы лялечнік нарадзіўся ў Брэсцкай вобласці, у вёсцы Сіманавічы Драгічынскага раёна. Быў малодшым з 12 дзяцей у сям'і.

— Бацька мой, Ігнацій Якаўлевіч, калі яму было каля 26 гадоў, вярнуўся на радзіму са Штатаў, куды з'ехаў з братам. Ён скончыў школу і жыў у Чыкага. Працаваў на прадпрыемстве, дзе шылі галаўныя ўборы, — распавядае суразмоўца.

Каханая чакала яго ў іх роднай вёсцы. Ажаніліся, працавалі старанна на зямлі і жылі багата. Мелі вялікі дом, 100 гектараў зямлі — дужа вялікі ўчастак і па сённяшніх мерках. Побач быў цудоўны бярозавы гай.

Калі былая тэрыторыя Польшчы ўвайшла ў склад савецкай Беларусі, бацьку раскулачылі. Каня — у калгасны статак, гаспадарчую забудову — пад агульныя патрэбы. Ігнацій Якаўлевіч стаў працаваць у калгасе. Памёр на 63-м годзе жыцця. З Брэстчыны ўдава з дзецьмі пераехала ў Краснадарскі край.

### Слова «любоў» гаварыў з акцэнтам

Да пераезду Віктар хадзіў у беларускамоўную школу, і ў Расіі яму праз гэта цяжка было вучыцца. Ды і аднагодкі з яго пасмейваліся.

— Я па-беларуску гаварыў, напрыклад: «любоў», «кучаравая». І не разумеў, што па-руску гэта няправільна. На Кубані скончыў 9-ты клас. Потым вучыўся ў вячэрняй школе. Мне там падабалася, бо вельмі добрыя былі выкладчыкі, а вучні атрымлівалі адукацыю не для атэстата. Шмат, дарэчы, было вучняў. Нават быў клас пад літарай «Ж». Потым паехаў у Таганрог — вучыцца на фармоўшчыка-ліцейшчыка ў ПТВ. А з малых гадоў марыў пра акцёрства. Разумеў, што з-за акцэнту не возьмуць, — усміхаецца Віктар Клімчук.

Хлопец не здраджваў сваёй мары. Дзеля яе ажыццяўлення шмат працаваў над сабой. У прыватнасці, каб «забыць» беларускую мову. Спачатку не шанцавала. Няўдала паступаў «на артыста» ў Саратаве і Маскве. Каля 1,5 года вучыўся ў студыі пры тэатры імя Чэхава ў Таганрогу.

У гэты час у Валгаградзе ў тэатры лялек аб'явілі набор кандыдатаў для вучобы і працы. Клімчука ўзялі, хаця было 10 прэтэндэнтаў на кожнае месца.

Вышэйшую рэжысёрскую адукацыю атрымаў у цяперашняй Самары. Вучыўся ў Куйбышаўскім дзяржаўным інстытуце культуры на драматычным аддзяленні.

— Мой настаўнік з вялікай літары — Пётр Львовіч Манастырскі, народны артыст СССР. Менавіта пад яго кіраўніцтвам самарскому тэатру надалі званне «акадэмічны». Рэжысёр ён выдатны і педагог ад Бога. Удзячны і яго маладым калегам — педагогам маім. Працавалі з намі, не шкадуючы сіл і часу. На жаль, Манастырскі тры гады таму пайшоў з жыцця, — кажа мастацкі кіраўнік.

Як рэжысёр лялечнага тэатра ён працаваў у розных гарадах былога СССР. Але яго цягнула ў родную Беларусь.

### «Лялька» — дачка драматычнага тэатра

Аднойчы Віктар Клімчук даведаўся, што ў Віцебску плануюць стварыць лялечную трупу.

— Прыехаў у Віцебск у 1985 годзе. Тады ў акадэмічным драматычным тэатры імя Якуба Коласа (цяпер Нацыянальны) задумалі цікавы праект. Дырэктар Геральд Асвяцінскі і мастацкі кіраўнік Валерый Мазынскі хацелі, каб гледачы хадзілі ў тэатр з самых малых гадоў. А для гэтага былі неабходныя спектаклі з удзелам лялечнікаў. Я даволі хутка набраў артыстаў, у асноўным з выпускнікоў Віцебскага вучылішча мастацтваў, і мы пачалі выступаць на вялікай сцэне.

Спадар Клімчук аднойчы зразумеў, што яго падначаленым патрэбная творчая самастойнасць. Шмат было цікавых ідэй, але іх нельга было ўвасобіць у межах рэпертуару «дарослага» тэатра. Да таго ж мясцовая ўлада планавала стварыць тэатр для дзятвы. Такім чынам, «зоркі сышліся».

Пад наваселле артыстаў і лялек выдзелілі вельмі прыгожы будынак, помнік архітэктуры XIX стагоддзя. Праўда, у глядзельнай зале ўсяго каля 130 месцаў. Сёння купіць квіток — праблема, бо амаль заўсёды аншлаг. Ёсць намер перадаць тэатру больш вялікі будынак, дзе калісьці працавала [illegible], але пытанне «завісла» праз фінансавыя праблемы.

— Як я віжу вырашэнне пытання? Было б добра побач з «Лялькай» узвесці будынак. І ў «Лялькі» былі б дзве сцэны, а самае галоўнае — больш гледачоў змаглі б убачыць спектаклі, — разважае рэжысёр.

### З-за «Карабаса» плачуць... гледачы

Баяўся, што суразмоўца пакрыўдзіцца на пытанне пра Карабаса Барабаса, а ён рассмяяўся.

— Думаю, некаторыя акцёры за вочы мяне так і называюць. Так, бываю строгім! А як жа яшчэ!? І пакрычаць магу, не без гэтага. Але без эмоцый жа нельга!

Тэма заробку акцёраў аказалася сумнай. Большасць думаюць, што акцёр — элітная прафесія, якая адпаведна аплачваецца. Аднак у рэальнасці гэта каля 3,5 мільёна недэнамінаваных рублёў у месяц. Мужчыны падпрацоўваюць на мантажы абсталявання і дэкарацый. Гэта дадае да заробку менш за 2 мільёны. Таму нехта ў свабодны час выкладае, нехта выступае на розных мерапрыемствах. Круцяцца як могуць.

— Як тут не сказаць пра магію тэатра? Яна ёсць! Тэатр не адпускае! Паверце, на сцэне заўсёды адбываецца нешта дзіўнае. Аднойчы акцёр, якога дагэтуль ведаю і які шмат разоў іграў у тым спектаклі, у пэўны момант «раствараўся» ў вобразе. Міміка зусім іншая, вочы. Калі б акцёры працавалі толькі дзеля грошай, быў бы дэфіцыт кадраў. А ў нас цякучкі няма. Звальняюцца толькі па сямейных абставінах.

Гледачы не раз прызнаваліся ў тым, што тэатр змяніў іх жыццё. Актрыса здавала экзамен на кіраванне аўтамабілем. Інструктар прызнаўся ёй, што яго сын, а яму гадоў 6-7 было, «не ўспрымаў бацьку». Павышаў голас, не слухаўся. Аднойчы ўбачыў спектакль «Хлопчык-зорка» і перамяніўся. Папрасіў зноў прывесці яго на гэты спектакль. Стаў выказваць любоў да маці і таты.

Да Віктара Клімчука часам падыходзяць незнаёмыя людзі і дзякуюць за жывое мастацтва і шчырасць.

І толькі аднойчы Клімчук пачуў «папрок»: чаму спектакль не на рускай мове? Дарэчы, за мяжой тэатр выступае без перакладу.

Асабіста мне аднойчы давялося стаць «ахвярай Карабаса»: рэжысёр прымусіў напрыканцы спектакля заплакаць. Добра, што ў зале было цёмна, і мае дзеці гэтага не заўважылі. А можа, трэба было?

### Тэатр узвышае...

— Дзяржава павінна аддаваць належнае інстытуту тэатра. Апошні фарміруе і ўзвышае чалавека, як і высокая літаратура, і музыка. Тут ён падсілкоўваецца духоўнасцю, знаходзіцца ў храме мастацтва. Глядач у тэатры працуе душой, эмоцыямі. Ён і павінен працаваць, а не «есці» тое, што даюць... Што можа пакінуць чарговы серыял? Ну, разбярэцца глядач: хто каму радня, хто каго падмануў, забіў. Але гэта не ўзбагаціць душу, не прымусіць суперажываць. Я — рамантык, які верыць у сілу сапраўднага мастацтва, — разважае рэжысёр.

Яго жонка працавала ў праектнай арганізацыі. Сыны сёння — у «Ляльцы». Міхаіл — артыст і рэжысёр. Летась адбылася прэм'ера яго цудоўнага спектакля «Горад клоўна Піка». Старэйшы сын — Аляксандр — загадчык мастацка-пастановачнай часткі.

Хобі мастацкага кіраўніка — прыводзіць адзенне ў ідэальны стан. Ён можа, напрыклад, звузіць штаны, шмат чаго яшчэ... Але «Лялька» не пакідае часу на гэта, як і на адпачынак.

### Лабараторыя мастацтва

Віцебскі лялечнік ставіць спектаклі і ў іншых тэатрах. Яго высока цэняць у Сербіі, Балгарыі, Польшчы, Расіі, Украіне. Часта запрашаюць у журы міжнародных фестываляў.

Сёлета на «Славянскім базары ў Віцебску» падчас «круглага стала», арганізаванага Міністэрствам інфармацыі і Выдавецкім домам «Звязда», Віктар Клімчук прапанаваў стварыць «творчыя лабараторыі» з удзелам крытыкаў, рэжысёраў, акцёраў. Каб яны абмяркоўвалі сучасныя тэндэнцыі ў мастацтве, рабілі даклады пра творчую спадчыну. Каб па выніках гэтай працы, калектыўнага «мазгавога штурму», выходзілі цікавыя кнігі.

«Лялька» — гаспадыня праекта «Лялечны квартал» на «Славянскім базары» — можа даць свае сцэны для такіх «лабараторый».

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

# МАЛІТВА ЗА ТВОРЦАЎ

## На Лунінеччыне адбылося XXV літаратурнае свята памяці рускага паэта Аляксандра Блока і даследчыка палескага перыяду яго жыцця Мікалая Калінковіча

**Другі год запар сустрэча краязнаўцаў і аматараў прыгожага пісьменства становіцца важнай часткай злёту праваслаўнай моладзі «Маранафа». Сёлета 48 юных прыхаджан сямі прыходаў Пінскага і Лунінецкага благачынняў у суправаджэнні 12 дарослых тры дні правялі на беразе жамчужыны Палесся. Цяпер могуць адрасаваць навакольным жартоўны верш Пімена Панчанкі:**

*«Вы былі на Белым возеры ці не?*

*Не былі? Дык не кампанія вы мне!..»*



Нягледзячы на тыповасць назвы, наша возера Белае — адно з двух у Беларусі (разам са Свіцяззю ў Карэліцкім раёне) з рэліктавай раслінай лабелія Дортмана, што ахоўваецца нават у Еўрапейскім саюзе. На сасне ў зялёным бары, што акружае блакітнае люстра, прымацавалі ікону Хрыста Збавіцеля, каля якой чыталі ранішняе і вячэрняе правілы. Але малітвы гучалі не толькі каля абраза Госпада, — сама навакольная прырода была іконай, да якой у думках звярталіся з просьбай аб захаванні тварэння Божага...

Сумеснымі намаганнямі педагогаў і святараў былі праведзены разнастайныя — духоўныя, экалагічныя, аздараўленчыя, спартыўна-турыстычныя — мерапрыемствы. Патрыятычнае выхаванне чырвонай ніткай злучала складнікі праграмы. Усклалі кветкі да помніка вёсцы Белае Возера, якая 19 студзеня 1944 года была знішчана фашыстамі і не адноўлена пасля вайны. У Луніне ўшанавалі памяць загінуўшых лётчыкаў Першай сусветнай вайны, якія пахаваны на пагосце.

Пасля святочнай літургіі, якую правёў архіепіскап Пінскі і Лунінецкі Сцяфан у саслужэнні духавенства, на двары Свята-Барыса-Глебскага храма разгарнулася літаратурнае свята. Нагадалі аб 100-годдзі прыезду ў нашы мясціны на вайсковую службу Аляксандра Блока (гэты факт ён занатаваў у сваім дзённіку, а ў наш час падзея адлюстравана мармуровай дошкай на будынку чыгуначнай станцыі Лоўча). Пазнаёмілі з кнігай «Палескія дні Аляксандра Блока», якую напісаў пісьменнік-зямляк Мікалай Калінковіч (1950—1990). Абодва творцы завяршылі зямны шлях летам (адпаведна 7 жніўня і 24 ліпеня). Літаратурную віктарыну, прысвечаную адметным падзеям у жыцці рускага паэта і пісьменніка-земляка правяла бібліятэкар з Луніна Лідзія Кірылаўна Цімашэй, а пераможцам яе стаў гімназіст Цімафей Хоміч (Пінск).

Разам з дарослымі дзеці ўшаноўвалі памяць князёў Барыса і Глеба — першых святых мучанікаў Рускай Праваслаўнай Царквы. На працягу ўжо больш як тысячагоддзя яны застаюцца прыкладам самаахвярнасці дзеля яднання Айчыны. Патрыятызмам прасякнута творчасць Аляксандра Блока і Мікалая Калінковіча, імёны якіх натуральна ўпляталіся ў агульную малітву за адданых роднай зямлі людзей...

**Таццяна КАНАПАЦКАЯ.**
**Фота аўтара.**

■ Сугучча

# Песні хваляванняў і маладосці

**Ван Гачжэнь — паэт, якога зараз у Кітаі ведаюць літаральна ўсе. Такім моцным быў яго ўзлёт у 1990-я гады. На жаль, ён рана пайшоў з жыцця.**

21 мая 1990 года выйшла ў свет першая паэтычная кніга Ван Гачжэня «Хваляванні маладосці». З гэтага ж часу і пачалося ўзвышэнне яркага, самабытнага паэта. Літаральна за некалькі гадоў тыраж перавыданняў кнігі дасягнуў 150 тысяч (!) экзэмпляраў. Уражвае, пагадзіцеся? У кастрычніку 1990 года — новая кніга: «Норавы маладосці». Дарэчы, тыраж яе перавыданняў уражвае не менш — 140 тысяч экзэмпляраў. З часам кітайскага чытача захапіць цэлы праект — дзевяцітомная серыя «Паэзія Ван Гачжэня», якая з'явілася дзякуючы намаганням выдавецтва «Юі». Цяпер творы паэта друкуюцца ў ЗША, Аўстраліі, Францыі, на Філіпінах, у Ганконгу і Сінгапуры, Італіі і Японіі. Сёння — 10 жніўня — да чытача прыходзіць першы беларускамоўны пераклад верша Ван Гачжэня «***Крык — як маўчання сон...». Перакладчыца — таленавітая беларуская паэтка Таццяна Сівец, якая мае багаты вопыт перастварэння паэтычных адкрыццяў іншых народаў.

**Сяргей ШЫЧКО.**

**Ван Гачжэнь**

* * *

*Крык — як маўчання сон.*
*Ціша — як немы крык.*
*Я не крычу — прывык.*
*Перапрашу — за ўсё.*
*За далягляд іду —*
*Горы не для слабых.*
*Не прыпыню хады,*
*Нат калі ногі збіў.*
*Сонца на сцежцы ўсцяж —*
*З болем іду далей.*
*З леташняга лісця —*
*Сёлетні квет лілей.*
*Шлях мой — на крок даўжэй*
*За найдаўжэйшы век.*
*Ад усіх гор вышэй —*
*Чалавек.*

**Пераклад з кітайскай Таццяны СІВЕЦ.**

■ Хто каго?

# «ВО БРАТКІ, Я РОБУ МАЮ: ВЕК НАСІЦЬ І НЕ ЗНАСІЦЬ!..»



**Што было, было. Адна жанчынка вырашыла жыццё змяніць: усё чыста кінула — падалася ў свет, прычым з новым мужам.**

**Што заставалася старому? Ды, вядома ж, — падацца ўслед. Праўда, не за ёю. Ён адзін (на шчасце ці на жаль — хіба разбярэш?) паехаў у вёску. Думаў — на нейкі час. А выйшла...**

Значыць, хаціна — якая-ніякая — у гэтага чалавека была. Ён узяўся парадак наводзіць: дзе сваімі рукамі, а дзе і чужымі нешта пераклейваць, фарбаваць, мяняць мэблю, платы...

Пакуль шчыраваў, вёска за ім назірала ды памагала пакрысе — у асноўным парадамі. Але і справы таксама былі: нехта рыштунку пазычаў, нехта — «ад знаёмай каровы» малако з тварагом прыносіў... Адзін мужык чорнага катка падарыў (а то, сказаў, мышы заядуць), другі — сабачку (а то, маўляў, што гэта за дом без вартаўніка: так і абакрасці могуць).

Але ж найбольш заезджага ўразіў трэці. Той без нічога-ніякага да ягонай хаты трактар падагнаў, і, пакуль гаспадар у краме быў, — задыскаваў агарод. Сказаў: «Усё, можаш бульбу садзіць». «Навошта? Я за зіму мяшка не з'ядаю. Мне прасцей будзе купіць», — стаў бараніцца дабраселец... Чым вельмі абурыў вяскоўца: «Вы паглядзіце на яго! — прапанаваў той Бог ведае каму і сам утаропіўся першым. — Мы тут дурныя ўсе да аднаго, мы бульбу садзім, а ён — дык разумны: ён не будзе!»

Што пасля гэтага заставалася рабіць? Ну вядома ж: пасадзіў той заезджы бульбу, потым, «як усе», баранаваў, абганяў, акучваў, палоў, збіраў «скавародскіх» жукоў...

Але ж не без толку: урадзіла ягоная картопля! Капае ўжо, са смакам есць (бо свая!), склеп для яе ж будуе. Больш за тое, задумваецца, можа, і праўда купіць парасят, калі ёсць чым карміць?

Карацей, «прапаў» чалавек — прынамсі, для горада. А вёска — рада, бо, што казаць, на ўліку там кожны добры чалавеча, кожная новая сям'я. Вось і гэтага, так бы мовіць, «энергетыка» (кіньце вочкам на верхні здымак. — **Аўт.**), вяскоўцы цёпла прынялі. «Здзівіў ён мяне, — прызнаецца, у прыватнасці, **спадарыня Галіна Пятроўская са Смаргоншчыны**. — Столькі дроў мае! У мяне вось муж і трое сыноў, і то столькі не насеклі. Значыць, пашчасціла нейкай жонцы:

*Добра Коля дроўцы коле!*
*На падворачку кладзе...*
*Хто за Колю замуж пойдзе*
*Той зімой не прападзе!»*

За гэтым Колем — як выглядае — не прападзе... ніколі, бо ён мала таго, што дроў насек (на сем зім), ён жа яшчэ і зямлю ўзорвае. А значыць, будзе, магчыма, бульбу садзіць (з усімі адсюль наступствамі — у выглядзе... парасят)?

Дарэчы, тая ж спадарыня Пятроўская згадвае ў сваім лісце, як некалі трапіла на з'езд настаўнікаў, як сустрэла там сваю аднагрупніцу Лену. «Даўно мы з ёй не бачыліся — мелі аб чым пагаварыць, — піша спадарыня Галіна. — У яе, расказала, памёр першы муж, яна выйшла за другога, якога некалі вельмі кахала. «Ну і каторы ж лепшы?» — папыталася я ў Лены. І ў адказ пачула: «Цяжка сказаць, бо свайго першага, я не вельмі і любіла, але ж дзяцей нажыла, а яшчэ, ці паверыш, сем гадоў яго дровамі грубку паліла! Рукасты быў, працаўнік. А з гэтым, з другім...»

З другім, як падалося, да месца будуць радкі **спадарыні Алены Кулік з Валожыншчыны:**

*Працы многа на падворку,*
*Без мужчыны — цяжка жыць...*
*З «Брэстэнерга» кліч Міколку*
*Каб араць, калоць, касіць...*

Мала верагоднага ў тым, што прадпрыемства, якое забяспечвае цяплом і святлом не толькі сваю вобласць, але і суседнія (нават замежныя), аказвае паслугі па нарыхтоўцы сена і дроў... А з іншага боку — пра заўтрашні дзень трэба думаць усім. А значыць, грэх не пагадзіцца са **спадаром Віктарам Трайкоўскім з Мінска:**

*Даражэюць нафта, газ,*
*Бо запасы —*
*у бок змяншэння...*
*Дык мо горай стане ў нас*
*З ацяпленнем, асвятленнем?*
*Хваляванне — без прычын,*
*«Брэстэнерга» ўжо гатова:*
*Прапануе ўсім мужчын,*
*Сілу рэк, вятроў і дровы.*

Хвала прадбачлівым, як той казаў! Але ж мае рацыю і **спадар Васіль Мірончык з Бабруйска:**

*Як ты, браце, ні старайся,*
*Ад марозу — не ўцячы:*
*На «...энерга» спадзявайся,*
*Але ж дроўцы й сам сячы!*

Кажуць, дарэчы, што найлепей — сукаватыя, бо яны двойчы грэюць: першы раз — пакуль колеш іх і другі — калі гараць. Шкада толькі (ва ўсякім разе **спадарыні Любові Чыгрынавай з Мінска**), што энергетык гэты адзін грэецца, што дапамогі яму няма:

*У Пятровіча кабету*
*Не падымеш да абеду...*
*Каб раней ён гэта знаў,*
*Замуж іншую б узяў!*

Але ж і цяпер страчана, магчыма, не ўсё? Парада — з таго ж канверта:

*Ты пастаў у баразне*
*Паўлітровачкі са дзве.*
*Не паспееш і міргнуць,*
*Як «сяброўкі» набягуць.*

І дапамогуць? Ці ўсё ж перашкодзяць?

А зрэшты — тут не пра жанчын, тут...

«Не ведаю, як хто, а я на апошнім здымку ўбачыў самага тыповага беларуса, — піша **спадар Гаўрыш з Чавусаў**. — Якраз ён і дэманструе нашу спрадвечную працавітасць, нашу запаслівасць і разлік на ўласныя сілы, наша імкненне быць незалежнымі».

Менавіта гэтыя рысы — як трэба разумець — і «прадыктавалі» наступныя радкі:

*Ёсць сумненняў трохі ў нас,*
*Што ратунак — толькі газ.*
*А таму ў Яся дроў*
*Аж на некалькі гадоў,*
*Тона бульбы ў агародзе,*
*Хлеў, дзе ходзяць «кумпячкі»...*
*З крамы ж —*
*соль, запалкі й годзе.*
*Крызіс нам — да лямпачкі!*

Гэтаму Ясю, яго жонцы, можа, і сапраўды?

У дзяцей іх таксама шанцы ёсць — і ў тых, што дапамагаюць бацькам, і ў тых, што не... Аб чым, дарэчы, хораша пішуць **сужэнцы Ніна ды Іван Астроўскія з Мінска**:

*Паглядзі, які размах:*
*Ясь на хутары шчыруе,*
*Пакуль дзеці ў гарадах*
*Жываты сабе гадуюць.*
*Яны ездзяць да бацькоў*
*Хіба ўзімку, хіба потым,*
*Каб набраць сабе «дароў»,*
*Што здабыты сёмым потам.*

Што казаць, дзеткі такія ёсць, прычым іх — нямала:

*Гарадскім лягчэй жывецца —*
*Ёсць святло, прадукты, газ!*
*Скуль вось гэта ўсё бярэцца,*
*Вам не кожны дасць адказ, —*

пішуць пра іх **сужэнцы Астроўскія**.

І гэта яшчэ за шчасце, калі «спажыўцы» проста не цікавяцца, а то ж могуць...

**Спадар Мікола Кісель з Мінска**, гледзячы на здымак, прыгадаў старую быль пра дровы. Помніце: ноччу ў акно нехта пастукаў: «Гаспадар, табе дровы патрэбны?» — «Не, на чорта?» — апярэдзіла тога жонка. Раніцай прачнуліся — дроў у двары нямашака. «Баба ёсць баба», — уздыхнуў муж... Як быццам сам адказаў бы неяк іначай, а тым больш спрасонку.

Адзінае, што ён падстрахавацца мог. Перш-наперш —

*Дроў насек — што трэба...*
*Ноччу, бач — адняты:*
*Быў «стажок» пад неба,*
*Стаў жа «худаваты».*
*А каму не спіцца,*
*Хочацца за краты,*
*Па слядах пазнае*
*Гэты вось араты!.*

Дык атрымліваецца, што ён не пад грады зямельку арэ, а спецыяльную паласу стварае (так лічыць яшчэ і **спадарыня Чыгрынава**) — на стыку сяліб, як на мяжы дзяржаў, бо яно ж і сапраўды:

*Любіць вёсачка старанных,*
*Што ты там ні гавары:*
*Ну ніводнай жа заганы*
*У рупліўца ў двары!*
*Але і ён — шчырак, не зломак*
*Доўга паласу рабіў,*
*Каб суседзе — пустадомак,*
*Певуна не падпусціў.*

А крый Бог пад сухія дровы...

Анекдот у тэму: група турыстаў хацела тыдзень-другі ў палатках пажыць — каля вады, каля рэчкі... Без вогнішча, без юшкі ім, ну, вядома ж, ніяк. Давялося пайсці да лесніка, добра падпаіць яго — папрасіць дроў. Той сказаў: «Бярыце, хлопцы, але так, каб я не бачыў. І ненадоўга».

А карацей — толькі ў **спадара Анатоля Гарачова з Іўеўшчыны**:

*Са зменамі складана ладзіць*
*І тут не так, і там не тое...*
*Не кожны нават бульбу*
*садзіць,*
*Вось дровы на зіму — святое!*

А яшчэ, відаць, — жаночыя капрызы. «Некалі ў мяне былі знаёмыя сужэнцы, — піша **спадарыня Чыгрынава**, — муж працаваў механізатарам, яго жонка — ветурачом. Трохі няроўны шлюб... Ва ўсякім разе свякроў часам казала сваёй адукаванай нявестцы: «Хай бы Колю што з адзежы купіла, можа, касцюм які-ніякі?» «А навошта ён яму трэба? Куды насіць, — фыркала нявестка. — У будні ён цэлымі днямі на працы, а ў выхадныя дома работы хапае. Я яму на складзе аж дзве спяцоўкі ўзяла».

Гэты дыялог, як трэба разумець, і падказаў **спадарыні Чыгрынавай** досыць сумныя радкі:

*Янку свята, Янку будзень —*
*Боты ды спяцоўка...*
*Але ў жонкі яго будзе*
*Модная абноўка!*

А зрэшты, адзін хоча сёе, другі тое, хто любіць гарбуз, а хто агуркі. Чытай: ёсць людзі, якім тую ж спяцоўку здымаць не хочацца, бо зручная, бо прыгожая, па фігуры. Вось і мужчына са здымка (паводле **спадарыні Чыгрынавай**) толькі выгляд робіць, што працуе, што дровы сячэ ды грады арэ, а на самай справе ён рэкламу робіць, аб'яўляе на ўвесь свет:

*Во, браткі, я робу маю:*
*Век насіць і не знасіць!*
*Як паслужыць мне да... раю*
*Дык і там буду фарсіць!*

Во які камплімент — сваёй фірме ды тым шаўцам-дызайнерам, што касцюм стварылі. Адзінае: на ўваходзе ў той рай могуць праблемы ўзнікнуць. Спытаюць апосталы: «Скуль, чалавеча?» Ён на абцасах крутнецца, спіну пакажа — чытайце, маўляў: «Брестэнерго». «А хіба ж гэта не беларускі горад, не беларускае прадпрыемства?» — здзівяцца «памежнікі». «Беларускія». — «А чаму ж тады не па-беларуску напісана?»...

Спытаюць так і, магчыма, не ў рай накіруюць, а... назад на зямлю, каб памылкі выправіў. Глядзіш, і затрымаецца на гэтым свеце, і пажыве яшчэ, папрацуе на зямлі і ў «Брэстэнерга»... «Я доўга думаў, з чым увязаць назву гэтай фірмы, бо дужа ж яна кідаецца ў вочы, — пісаў **спадар Валерый Гаўрыш**. — Падказку знайшоў у рэпартажы з фестывалю беларускага народнага гумару:

*Зноўку смех у Аўцюках —*
*Свята — грандыёзнае!*
*А таму ў гэтых размах*
*Чуткі аж у Лёзне!..*
*Шчыры дзякуй, землякі,*
*За такое свята:*
*Хоць не вельмі нафты ў нас,*
*Цеплыні багата!*

Што праўда, тое праўда: і цеплыні, і дабрыні, і вершаў, і песень, і гумару, і...

Пералік гэты кожны можа прадоўжыць сам. Нам жа, як заўжды, застаецца падвесці вынікі.

Такім чынам найлепшыя радкі пра кабет каля пустой кінаафішы (гл. «Звязду» за 7 чэрвеня), паводле меркаванняў вялікага чытацкага журы, напісалі **спадары Валерый Гаўрыш з Чавусаў, Мікалай Старых з Гомеля, сужэнцы Астроўскія з Мінска, спадарыні Валянціна Гудачкова з Жыткавічаў, Соф'я Кусянкова з вёскі Лучын Рагачоўскага раёна і Алена Кулік з вёскі Нелюбы Валожынскага...**

Вось з гэтым, апошнім, меркаваннем, пагадзілася і журы маленькае, рэдакцыйнае. Таму прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам газету на чацвёрты квартал бягучага года накіроўваецца на Валожыншчыну. Што, магчыма, цікава — дэбютантцы нашага, звяздоўскага конкурсу на лепшы подпіс да здымка.

Адкуль выснова — далучыцца да кола яго ўдзельнікаў ды паспрабаваць свае сілы аніколі не позна. Пішыце: умовы ранейшыя: коратка (колькасць прапаноў не абмежаваная, але ў кожнай не больш за восем радкоў), дасціпна, па-беларуску. Здымак, як заўжды, дадаецца.

**Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.